**А.Р. Агееў**
*(Магілёўскі дзяржаўны універсітэт*
*імя А.А.Куляшова, г.Магілёў)*

# РОЛЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ ОРГАНАЎ У ФАРМІРАВАННІ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНЫХ УСТАНОВАК ЖЫХАРОЎ МАГІЛЁВА: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Праблема фарміравання этнічных стэрэатыпаў і этнапалітычных установак мяне цікавіла з 1991 г. З таго часу ў вучэбных мэтах я праводжу бліц апытанне студэнтаў першага курсу гістарычнага факультэта МДУ імя А.Куляшова на прадмет іх еўрапейскасці. Напачатку 90-х на прамое пытанне з аўдыторыі каля 100 чалавек толькі 5-7 называла сябе еўрапейцамі. У канцы 90-х і на пачатку XXI стагоддзя сітуацыя змянілася да адваротнай. Што паспрыяла лавінападобнаму павелічэнню разумення сваёй еўрапейскай ідэнтычнасці студэнтаў гуманітарыяў? Можна прыняць за аксіёму тое, што паколькі ў моцна цэнтралізаваных краінах уплыў дзяржавы на ўсе бакі грамадскага і сацыяльнага жыцця дужа моцны, то ігнараваць ролю дзяржавы на фарміраванні знешне і ўнутрыпалітычных установак беларусаў немагчыма.

Аб неабходнасці правядзення шматвектарнай знешняй палітыкі краіны неаднаразова заяўлялі першыя асобы нашай краіны. Сёння гэта відавочна практычна для ўсіх беларускіх палітычных сіл. Тэарэтычна ў гэтым пытанні ёсць згода і няма вялікай праблемы. Калі афіцыйныя палітычныя кантакты вышэйшых дзяржаўных органаў з заходнееўрапейскімі структурамі абмежаваныя, адным з рэальных накірункаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выхаду з крызісу ўзаемаадносін маглі б стаць гарызантальныя сувязі органаў сярэдняга звяна, у тым ліку і рэгіянальных.

Неабходна адзначыць дзейнасць амбасадаў краін Еўразвязу ў справе фарміравання станоўчых для краін Еўразвязу ўстановак жыхароў Магілёўшчыны. Па дыпламатычным традыцыям паслы знаёмяцца з краінай і наведваюць усе рэгіёны. Пад час падобных візітаў распачыналіся многія сумесныя праекты супрацоўніцтва, як грамадскага сектара, так і афіцыйных дзяржаўных структур. Безумоўна, гаворка тут ідзе перш наперш аб гуманітарных і культурных праектах. Так, пры моцным спрыянні польскай амбасады напачатку ладзіўся музычны фестываль«Магутны Божа».

Адным з рэальных накірункаў, дзе на рэгіянальным узроўні супрацоўніцтва з заходнееўрапейскімі краінамі развіваецца, з'яўляецца развіццё братэрскіх сувязяў паміж гарадамі пабрацімамі. У Магілёва 9 гарадоў-пабрацімаў. Ён мае дамовы аб пабрацімскіх сувязях з гарадамі: Тула (РФ), Габрава (Балгарыя), Улацлавек (Польшча), Айзенах (Германія), Клайпеда (Літва), Керч (Украіна), Бардыёф (Славакія), Вілербан (Францыя) і ў 2006 годзе горад Крагуевац (Сербія). Сярод гарадоў пабрацімаў больш паловы – пяць знаходзяцца ў краінах Еўразвязу. Што цікава і паказальна, у афіцыйным спісе гарвыканкама Тула (Расія) стаіць на першым месцы, што адлюстроўвае рэальную інтэнсіўнасць супрацоўніцтва.

У практыку супрацоўніцтва з гарадамі пабрацімамі і гарадамі партнёрамі увайшло правядзенне эканамічных місій. Падобныя кантакты пакуль развіваюцца толькі з Расіяй. Адной з перспектыўных форм супрацоўніцтва з'яўляецца ўдзел горада Магілёва ў буйных Міжнародных арганізацыях. Магілёў з'яўляецца членам Міжнароднай Асамблеі сталіц і буйных гарадоў (МАГ).

Сярод прыярытэтаў Магілёўскага абласнога і гарадскога Савета дэпутатаў развіццё знешнепалітычных кантактаў з заходнімі краінамі да апошняга часу не значылася. Фінансаванне на гэтыя мэты не прадугледжвалася. Гаворка ішла толькі аб сувязях з гарадамі пабрацімамі.

«Народная дыпламатыя» здольная вырашаць праблемы, якія часам не ў стане вырашыць палітыкі. Аздараўленне, гасцяванне у сем'ях замежнікаў, як правіла, фарміруе станоўчы вобраз краіны знаходжання. Але апошнім часам выезды за мяжу студэнтаў, школьнікаў рэзка зменшыліся. Трэба адзначыць, што абмежаванне кантактаў у гэтай сферы ішло з абодвух бакоў. Многія заходнія краіны пасля тэрактаў 11 верасня 2001 г. ускладнілі працэдуры ўезду.

Магчыма на невысокі ўзровень кантактаў з краінамі Еўрапейскага саюзу ўплываюць сфарміраваныя знешнепалітычныя ўстаноўкі нега-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тыўнага ўспрымання Еўропы насельніцтвам Беларусі? Вынікі анкетавання маладых магілеўчан не пацвярджаюць гэтага уяўлення. У 2001 г. Кафедра гуманітарных дысцыплін Магілёўскага універсітэта харчавання правяла анкетаванне магілеўчан. Прадстаўнікі ўсіх прапанаваных у анкеце заходнееўрапейскіх этнасаў у большасці рэспандэнтаў выклікалі або сімпатыі, або ўспрымаліся нейтральна. Не супраць былі аб'яднацца з Германіяй 14,84% анкетаваных, з Польшчай 13,6%, а з усімі краінамі Заходняй Еўропы – 28,34%. Для параўнання: з Расіяй 39,8. Анкетаванне моладзі У 2005 г. таксама паказала, што сярод названых непажаданымі на тэрыторыі Беларусі нацый прадстаўнікі краін Еўрапейскага саюзу мелі адзін з самых нізкіх узроўняў негатыўнага ўспрымання.

У пачатку XXI стагоддзя на *рэгіянальным узроўні* найбольш пазітыўна развіваліся з заходнееўрапейскімі краінамі эканамічныя сувязі. Пасля далучэння Польшчы, Літвы і Латвіі Еўразвяз стаў другім па працягласці дзяржаўнай мяжы суседам Беларусі, саступаючы толькі Расіі. У выступленнях *афіцыйных* асоб да апошняга часу падкрэслівалася адрозніванне палітыкі ЗША і ЕС у дачыненні да Беларусі. Апошняе тэарэтычна давала больш магчымасцяў як для наладжвання кантактаў, так і для фарміравання пазітыўнага іміджу ЕЗ у вачах беларусаў.

Усходнія раёны Беларусі аб'ектыўна знаходзяцца ў зоне прыцягнення Расійскіх эканамічных гігантаў *Масквы і С.Пецярбурга*, Але і эканамічныя сувязі з ЕЗ інтэнсіўна развіваюцца. Паколькі беларуская дзяржава працэсы знешнеэканамічнай дзейнасці не толькі кантралюе, але і спрабуе рэгуляваць, то важна разгледзіць яе дзеянні і на гэтым узроўні. Адным са спосабаў *дасягнення* станоўчага сальда знешнегандлёвага абароту ўрад бачыў у 2007 г. развіццё экспарту ў краіны Еўрасаюза. У рамках нацыянальнай праграмы развіцця экспарту 2006- 2010 распрацоўваюцца штогадовыя планы мерапрыемстваў. У яе рамках былі дадзены *канкрэтныя* даручэнні магілёўскім прадпрыемствам. З Магілёўскіх заданні былі дадзены толькі МоАЗу у Казахстане і Магілёўскаму малочнаму камбінату у Расіі.

З 2003 г. ў Магілёве праводзяцца інвестканферэнцыі, на якія запрашаюцца еўрапейскія партнёры. Сёння ўрад патрабуе ў рамках двухбаковых пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі і гарадамі-пабрацімамі распрацаваць планы гандлёва-эканамічных сувязяў.

Статыстыка паказвае, што 2003-2007 гг. магілёўскі экспарт узрос на 162%, а ўвогуле знешні гандлёвы абарот на 160%. Знешнегандлёвы абарот г. Магілёва за 2007 г. склаў 1405273.1 тыс. дол. ЗША. Экспарт – 761164.8. Імпарт – 644108.3. Сальда 117056.5. Асноўным пакупніком прадукцыі для Магілёўскіх таваравытворцаў застаецца Расія. У 2007 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

69 %. (71,4% у 2006 г.) усяго магілёўскага экспарту накіроўваецца на расійскі рынак.Расія таксама з'яўляецца асноўным пастаўшчыком прадукцыі для прадпрыемстваў Магілёва. Удзельная вага паставак з Расіі склала 54% (52% у 2006 г.) ад усяго імпарту Магілёва.

| Найменаванне | | Тавараабарот | Экспарт | Імпарт | Сальда |
|---|---|---|---|---|---|
| Страны ЕС | 2006 | 320259.2 | 130412.4 | 189846.8 | -59434.4 |
| | 2007 | 305998.7 | 128781.8 | 177216.9 | -48435.1 |
| | рост % | 95.5 | 98.7 | 93.3 | |

Доля краін Еўразвязу у гандлёвым абароце Магілёва склала 21, 77%. Яна за год зменшылася на 4,5%. Асноўным гандлёвым партнёрам з краін далёкага замежжа для Магілёва з'яўляецца Германія. Але гандлёвы абарот з ёй у 2007 г. зменшыўся на 13,9% і склаў 158789.9 тыс. дал., толькі 11,3% ад усяго абароту. Рэспубліка Польшча ў знешнім гандлі г. Магілёва з краінамі далёкага замежжа займае другое месца. Літва у знешнім гандлі г. Магілёва уваходзіць у першую пяцёрку краін далёкага замежжа. Асабліва вялікі аб'ём абароту з суседзямі. Нездарма зараз менавіта Літва, Латвія і Польшча выступалі супраць эканамічных санкцый супраць Беларусі.

Нельга абыйсці і ролю дзяржаўнай прэсы і тэлебачання. Пры усёй аднастайнасці, нецікавасці інфармацыйных блокаў, іх уплыў на насельніцтва вельмі істотны. У рэгіянальнай прэсе аб заходнееўрапейскіх краінах пераважаюць матэрыялы негатыўнага, або нейтральнага характару.

У заключэнне адзначым, што нельга казаць аб асобай палітыцы на Магілёўшчыне, тут рэалізуецца агульнабеларуская палітыка. Задужа моцная цэнтралізацыя дзяржаўнай улады не спрыяе развіццю ўзаемакарысных кантактаў і сувязяў з еўрапейскімі краінамі, абмяжоўвае ініцыятыву менеджэраў сярэдняга звяна. На мясцовым узроўні не ставіцца задача паляпшэння іміджу Еўропы ў вачах насельніцтва, але рэальныя культурныя, навукова-тэхнічныя, бізнес кантакты спрыяюць гэтаму.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова